# Міжнародны дзень студэнтаў

ПРАГРЭСІЎНАЕ студэнцтва ўсяго свету 17 лістапада адзначыла Міжнародны дзень студэнтаў.

17 лістапада 1939 года непадалёку ад Прагі фашысты расстралялі вялікую групу чэшскіх студэнтаў, якія вялі актыўную барацьбу супраць нямецкіх захопнікаў.

Кангрэс студэнтаў, які праходзіў у 1941 годзе ў Лондане і прадстаўляў краіны антыгітлераўскай кааліцыі, аб'явіў гэты дзень—17 лістапада—Міжнародным днём студэнтаў, заявіўшы аб сваёй рашучасці змагацца да поўнай перамогі над фашызмам і мілітарызмам, каб пабудаваць мір, у якім не будзе месца ні фашызму, ні вайне.

У гэтыя грозныя гады, калі ў барацьбе з фашызмам вырашаліся лёсы чалавецтва, сотні тысяч студэнтаў многіх краін свету, адклаўшы канспекты і кнігі і ўзяўшы ў рукі вінтоўкі і аўтаматы, разам з усёй моладдзю краін антыгітлераўскай кааліцыі аддавалі ўсе свае сілы і веды, усю сваю волю і энтузіязм, а часта і жыццё, каб наблізіць дзень перамогі. І калі гэты доўгачаканы дзень настаў, прадстаўнікі студэнтаў розных краін і кантынентаў, сабраўшыся на I Сусветны студэнцкі кангрэс у Празе, вырашылі, што салідарнасць, якая нарадзілася ў барацьбе і змацавана крывёю тысяч іх сяброў-студэнтаў, павінна ператварыцца ў салідарнасць сумеснай працы на карысць развіцця грамадства. Створаны па рашэнню гэтага кангрэсу Міжнародны Саюз студэнтаў (МСС) асноўнымі задачамі сваёй дзейнасці лічыць намаганні, накіраваныя на ўмацаванне дружбы паміж народамі, на захаванне міру, развіццё і ўмацаванне салідарнасці са студэнтамі каланіяльных краін у барацьбе за нацыянальную незалежнасць, на развіццё шырокага супрацоўніцтва ў галіне культуры, навукі, спорта, падарожжаў, на паслядоўнае правядзенне ў жыццё таго прынцыпу, што вышэйшыя навучальныя ўстановы павінны быць даступны для ўсіх маладых людзей без адрознення іх сацыяльнага паходжання.

Стварэнне МСС (1946 г.) знамянавала сабою новы этап у гісторыі міжнароднага студэнцкага руху. Аб'яднаўшыся ў адну арганізацыю, студэнты могуць яшчэ больш актыўна ўдзельнічаць у вырашэнні розных міжнародных праблем, абменьвацца вопытам у вырашэнні хвалюючых іх пытанняў і абапірацца на салідарнасць усяго міжнароднага студэнцкага руху.

Актыўная барацьба МСС супраць адраджэння фашызма і супраць небяспекі новай вайны, супраць каланіялізма, за дэмакратызацыю вышэйшай адукацыі, няўхільны рост яго аўтарытэту і ўплыву сярод студэнцтва хутка пачалі выклікаць незадаволенне і процідзеянне з боку рэакцыйнага кіраўніцтва раду нацыянальных студэнцкіх саюзаў капіталістычных краін.

Імкнучыся падарваць аўтарытэт МСС у вачах студэнцкіх мас сваіх краін, лідэры студэнцкіх арганізацый ЗША, Англіі, Заходняй Германіі, Даніі і іншых капіталістычных краін у 1948—1949 гадах выступілі з паклёпніцкімі абвінавачваннямі МСС у «аднабаковай» палітычнай дзейнасці і з заявамі аб тым, што ідэалы, на аснове якіх быў створан МСС, цяпер устарэлі і што «адгэтуль студэнт павінен займацца толькі пытаннямі сваёй вучобы, а грамадскія і палітычныя праблемы яго не датычаць». Гэта была славутая канцэпцыя «студэнтаў як такіх». На падставе гэтай канцэпцыі студэнцкія кіраўнікі з Англіі і Скандынаўскіх краін выступілі з прапановай ператварыць МСС у чыста тэхнічны цэнтр, які б адмовіўся ад такіх дзеянняў, як барацьба за мір, супраць каланіялізма, за дэмакратызацыю адукацыі. Гэтая прапанова, натуральна, была адхілена большасцю студэнцкіх арганізацый, якія ўваходзілі ў МСС. Тады нацыянальныя саюзы студэнтаў Англіі, Даніі і другіх капіталістычных краін выйшлі з МСС, спадзяючыся такім шляхам разваліць гэтую арганізацыю.

Калі правалілася і гэтая спроба, лідэры студэнцкіх арганізацый ЗША, Англіі, Заходняй Германіі і раду іншых краін, якія знаходзіліся пад уплывам рэакцыйных колаў імперыялістычнай буржуазіі, завяршылі пачаты імі раскол міжнароднага студэнцкага руху стварэннем новага студэнцкага цэнтра, які мог бы процістаяць прагрэсіўнай дзейнасці МСС. Гэта быў КАСЕК—каардынацыйны сакратарыят міжнароднай студэнцкай канферэнцыі.

Імкнучыся пераадолець раскол і ўстанавіць адзінства міжнароднага студэнцкага руху, МСС арганізаваў цэлы рад сумесных мерапрыемстваў—розных сустрэч, канферэнцый, семінараў, фестываляў, спартыўных гульняў, мастацкіх конкурсаў, на якія запрашаліся студэнцкія арганізацыі, уваходзячыя не толькі ў МСС, але і ў КАСЕК.

Аднак кіраўніцтва КАСЕК'а ўсяляк перашкаджае ўстанаўленню адзінства міжнароднага студэнцкага руху, працягвае дзейнічаць у духу «халоднай вайны», выкарыстоўваючы апалітызм як маскіравальны плашч для прыкрыцця рэакцыйнай палітыкі. «Апалітызм» КАСЕК'а асабліва ярка праявіўся на яго восьмай па ліку канферэнцыі, якая адбылася ў сталіцы паўднёваамерыканскай дзяржавы Перу Ліме ў лютым 1959 года. Удзельнікі гэтай канферэнцыі зноў паднялі шуміху вакол правакацыйнага пытання «аб становішчы студэнтаў у Венгрыі» і ні словам не абмовіліся аб сапраўды трагічным становішчы студэнцтва ў краінах Чорнай Афрыкі і ў Паўднёва-Афрыканскім Саюзе. Яны абрушваліся на сістэму адукацыі ў ГДР, але не знайшлі ніводнага слова для асуджэння ўсё больш наглеючага ў Заходняй Германіі фашызма. Усё гэта робіць відавочным, што апалітызм КАСЕК'а стаіць на службе імперыялістычнай рэакцыі.

Палітычны характар і залежнасць КАСЕК'а ад амерыканскіх манаполій становяцца зусім відавочнымі пры вывучэнні яго бюджэту. У цяперашні час 90 працэнтаў усіх паступленняў КАСЕК'а складаюць сродкі, якія ідуць з так званага «фонду на патрэбы моладзі і студэнтаў», які знаходзіцца ў Н'ю-Йорку. Зусім відавочна, што арганізацыя, у якой узносы ад студэнцкіх аб'яднанняў складаюць толькі 10 працэнтаў бюджэту, а астатнія грошы паступаюць з нестудэнцкай крыніцы, знаходзіцца ў поўнай залежнасці ад апоншяй. Можна смела сцвярджаць, што яе фактычнымі гаспадарамі з'яўляюцца амерыканскія манапалісты.

*

**Я. БАБОСАЎ.**

*

Міжнародная студэнцкая арганізацыя, якая на самай справе хоча абараняць інтарэсы студэнтаў, — калі нават яна павінна быць беспартыйнай, — не можа быць апалітычнай.

Ні для кога ж не сакрэт, што галоўная праблема, якая стаіць перад студэнтамі многіх капіталістычных краін, — гэта не вучоба, а пошукі сродкаў для звядзення канцоў з канцамі. Пытанні матэрыяльнага забеспячэння — адна з самых вострых і складаных праблем, якія стаяць перад студэнцтвам капіталістычных краін.

У Францыі, напрыклад, менш адной пятай студэнтаў (17 працэнтаў) атрымлівае стыпендыі, а адна трэцяя частка студэнтаў вымушана працаваць, каб забяспечыць сабе пражытачны мінімум. Сярэдні размер стыпендыі тут не перавышае 140 тысяч франкаў у год — яўна недастаткова, калі ўлічыць, што для забеспячэння пражытачнага мінімума патрабуецца не менш 300 тысяч франкаў у год.

У Заходняй Германіі стыпендыі атрымліваюць толькі 20 працэнтаў студэнтаў. Акрамя дзяржаўнай стыпендыі тут, як і ў многіх іншых краінах капіталу, існуе прыватная стыпендыя, якая прадастаўляецца рознымі кампаніямі, асобнымі таварыствамі і асобамі. Размеркаванне дзяржаўных стыпендый, не гаворачы ўжо аб прыватных, адбываецца не па матэрыяльных, а па сацыяльных і палітычных меркаваннях.

У Японіі цяпер атрымліваюць стыпендыі толькі 25 працэнтаў студэнтаў. Размер стыпендыі дасягае 2—8 тысяч іен у месяц і не перавышае кошт кватэрплаты для студэнтаў у Токіо. Але гэта не стыпендыі ў сапраўдным сэнсе слова, а пазыка Японскага стыпендыяльнага фонду, якая павінна быць выплачана выпускніком пасля заканчэння універсітэта. Цяпер гадавыя выдаткі японскага студэнта на аплату вучобы хістаюцца ад 9 тысяч іен у дзяржаўных універсітэтах да 20—30 тысяч у прыватных вышэйшых навучальных установах, а ў некаторых выпадках дасягаюць 50 тысяч іен. Па даных абследвання ўмоў жыцця студэнтаў універсітэта ў Кіёта, 42 працэнты студэнтаў павінны працаваць, каб пакрыць выдаткі свайго бюджэту.

У многіх капіталістычных краінах вельмі дарага каштуюць падручнікі. Так, напрыклад, у Велікабрытаніі падручнік анатоміі каштуе 5,5 фунтаў стэрлінгаў, што складае тыднёвы заработак кваліфікаванага рабочага. У Аўстрыі падручнікі яшчэ даражэйшыя — уводзіны ў тэарэтычную фізіку каштуюць там 327 шылінгаў.

Студэнты, як правіла, самі павінны плаціць за здачу экзаменаў, за карыстанне бібліятэкай, лабараторыяй, за матэрыялы, выкарыстаныя для практычных, курсавых, дыпломных работ. Напрыклад, у школе мастацтваў Сант-Яга (Чылі) толькі для падрыхтоўкі дыпломнай работы трэба набыць матэрыялу на 150 тысяч песа.

Вынікам цяжкіх матэрыяльных умоў з'яўляецца вялікі адсеў студэнтаў у працэсе вучобы. У Францыі толькі 25 працэнтаў студэнтаў заканчваюць вышэйшыя школы і атрымліваюць дыпломы, а астатнія 75 працэнтаў кідаюць вучобу на розных курсах навучання. У 1958 годзе з 70 чалавек, прынятых у свой час на геалагічнае аддзяленне Эдзінбургскага універсітэта (Шатландыя) толькі 8 чалавек закончылі універсітэт і атрымалі дыпломы.

Многія вышэйшыя навучальныя ўстановы капіталістычных краін адчуваюць востры недахоп у вучэбных памяшканнях. Так, напрыклад, у вядомым Сарбонскім універсітэце (Францыя) амаль усе існуючыя сёлета карпусы былі пабудаваны ў 1890 годзе ў разліку на 2 тысячы студэнтаў. Цяпер у гэтых жа самых карпусах займаецца 30 тысяч чалавек. Не дзіўна таму, што многія студэнты Сарбоны вымушаны стоячы слухаць лекцыі і канспектаваць іх, трымаючы сшыткі на спінах у таварышаў.

Адсутнасць дастатковых сродкаў для платы за навучанне, за падручнікі, якія вельмі дарагія, за матэрыялы для практычных работ і вопытаў, адсутнасць інтэрнатаў, стыпендый, — гэтая высокая сцяна, пры дапамозе якой маёмасныя класы адгараджваюць вышэйшую адукацыю ад рабочых і сялян. Гэта знаходзіць сваё адлюстраванне ў сацыяльным складзе студэнтаў у капіталістычных краінах. У Францыі дзеці рабочых і сялян складаюць 4,2 працэнта студэнтаў, у Канадзе — 7 працэнтаў, у Англіі — 10—16 працэнтаў.

Толькі ва ўмовах сацыялістычнага ладу забяспечваюцца не фармальныя, а рэальныя магчымасці для атрымання вышэйшай адукацыі, бо толькі сацыялізм робіць вышэйшую школу сапраўды даступнай для народных мас. Адным з важнейшых умоў даступнасці вышэйшай адукацыі ў нашай краіне з'яўляецца бясплатнасць адукацыі.

У калоніях і залежных краінах, дзе паміма класавай няроўнасці вялікую ролю адыгрывае палітыка нацыянальнага прыгнёту, карціна вышэйшай адукацыі ў жыцці студэнтаў яшчэ больш цяжкая, чым у краінах капіталу. Каланізатары душаць нацыянальную культуру, нацыянальную адукацыю. Нешматлікія школы і універсітэты рыхтуюць у асноўным тэхнічныя кадры для каланіяльнай адміністрацыі. Толькі 0,029 працэнта насельніцтва Французскай Афрыкі паступае ў сярэднія і вышэйшыя навучальныя ўстановы. Студэнты каланіяльных і залежных краін ўсё больш ясна разумеюць, што яны змогуць правільна вырашыць праблемы, якія стаяць перад імі толькі ў тым выпадку, калі яны будуць весці разам з усім народам рашучую барацьбу супраць каланіялізма за нацыянальную незалежнасць сваіх краін.

Растучая роля студэнтаў і студэнцкіх арганізацый у барацьбе з каланіялізмам складае адну з найбольш важных рысаў сучаснага студэнцкага руху. Таму МСС з дня свайго стварэння паслядоўна праводзіць антыкаланіяльную палітыку.

Прыхільнікі «апалітычнасці» крытыкуюць МСС за тое, што ён займаецца праблемай міру, бо па іх словах пытанне міру не ўплывае на «студэнтаў як такіх» і таму нацыянальныя студэнцкія арганізацыі не павінны ім займацца. Наколькі гэтая заява абсурдная, відавочна для ўсіх, хто разумее простую ісціну, што праблема міру з'яўляецца цяпер пытаннем нумар адзін не толькі для студэнтаў, але для ўсіх народаў зямлі, для будучыні ўсяго чалавецтва.

Цяпер у актыўную барацьбу за захаванне і ўмацаванне міру ўключаюцца ўсё новыя і новыя групы студэнтаў ва ўсіх кутках зямнога шару, і ніякія закліnанні КАСЕК'а не змогуць пярэчыць гэтаму магутнаму руху. Нягледзячы на процідзеянне рэакцыйных студэнцкіх лідэраў і нават насупраць яму, выступленні студэнтаў капіталістычных краін за мір супраць пагрозы новай вайны прымаюць усё больш масавы характар.

Гэта можна ясна ўбачыць на прыкладзе Вялікабрытаніі. Усё часцей у друку паяўляюцца паведамленні аб студэнцкіх выступленнях у абарону міру ў розных універсітэтах Вялікабрытаніі. Гэтыя выступленні носяць форму сустрэч, дэбатаў, канферэнцый, апытанняў студэнцкай думкі і г. д. і канцэнтруюцца галоўным чынам вакол патрабавання аб неадкладнай забароне выпрабаванняў ядзернай зброі, за поўнае ўсеагульнае раззбраенне.

І вельмі знамянальна, што першы ў Велікабрытаніі студэнцкі камітэт абароны міру быў створан у Эдзінбургскім універсітэце — у тым самым універсітэце, дзе ў 1952 годзе рэакцыйныя лідары студэнцкіх саюзаў капіталістычных краін сфармулявалі сваё крэда «апалітычнасці» і арганізацыйна аформілі раскол міжнароднага студэнцкага руху стварэннем КАСЕК'а.

Актыўна ўдзельнічаючы ў рабоце МСС, студэнцкія арганізацыі нашай краіны, прадстаўленыя Студэнцкім Саветам пры Камітэце маладзёжных арганізацый СССР, не толькі пасылаюць сваіх прадстаўнікоў на розныя міжнародныя студэнцкія сустрэчы, дыскусіі, канферэнцыі і семінары, якія праходзяць у зарубежных краінах, але і арганізуюць пры дапамозе МСС такія сустрэчы, канферэнцыі і семінары ў Савецкім Саюзе.

Значнае месца ў гісторыі міжнароднага студэнцкага руху заняў праведзены ў верасні 1959 года ў памяшканні Маскоўскага універсітэта міжнародны студэнцкі семінар на тэму: «Вышэйшая адукацыя ў СССР». У ім удзельнічалі прадстаўнікі студэнцкіх арганізацый 42 краін Еўропы, Азіі, Амерыкі і Афрыкі. Тэма гэтага семінара выклікана велізарнай цікавасцю зарубежнай моладзі да жыцця савецкіх студэнтаў. Удзельнікі семінара падрабязна азнаёміліся з арганізацыяй вучэбнага працэсу і жыццём студэнтаў Савецкага Саюза.

З вялікай цікавасцю слухалі пасланцы студэнтаў Еўропы і Азіі, Амерыкі і Афрыкі расказы прадстаўнікоў студэнцкіх арганізацый Масквы, Ленінграда, Кіева, Мінска, Тбілісі аб актыўным удзеле савецкіх студэнтаў у грамадскім жыцці, аб працоўным выхаванні нашай студэнцкай моладзі.

Гарачая дыскусія праходзіла не толькі ў зале пасяджэння семінара, але і ў час перапынкаў, у пакоях, дзе пражывалі яго ўдзельнікі. І хоць па асобных пытаннях яны выказвалі розныя думкі, усе заўсёды сходзіліся ў адным — самае галоўнае для моладзі — гэта мір і дружба.

Усе ўдзельнікі семінара згадзіліся са словамі аспіранта МГУ Владлена Іванова, што значна лепш сядзець за студэнцкім сталом, чым ляжаць адзін супраць другога у акопах.

У гэтыя дні ў Берліне праходзіць студэнцкі семінар, прысвечаны праблеме мірнага аб'яднання Германіі. Яго ўдзельнікаў вітаў славуты барацьбіт за мір М. С. Хрушчоў. Семінар у Берліне з'явіўся яшчэ адным доказам адданасці студэнтаў справе міру.

Адзначаючы міжнародны студэнцкі дзень, студэнты нашага універсітэта, як і ўсяго Савецкага Саюза, дэманструюць гатоўнасць аддаць усе свае сілы і веды, усю энергію і энтузіязм маладосці на шчасце міру і дружбы, унесці дастойны ўклад у справу пабудовы камуністычнага грамадства ў нашай краіне.



НА ЗДЫМКУ: выступае танцавальны калектыў універсітэта.
Фота В. АНЦЫФЕРАВА.

Рэдактар М. ЦІКОЦКІ.

АБ'ЯВА

З 23 лістапада па серадах з 19 да 22 гадзін у 55 аўдыторыі біякорпуса працуе

**ВУЧЭБНА-КАНСУЛЬТАЦЫЙНЫ ПУНКТ**

па матэматыцы і фізіцы для студэнтаў першых курсаў дзённых і вячэрніх аддзяленняў усіх факультэтаў.

**Камітэт камсамола, прафком.**

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
**Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, 31. Тэлефон: 2-07-19.**

**Друкарня выдавецтва БДУ імя У. І. Леніна**

АТ 00534. Зак. 1952.